**Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
**Упраўленне культуры Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта**
**Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік**

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

***20–21 лістапада 2024 г.***
*навукова-даследчая і асветная ўстанова культуры*
*«Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік»*
*праводзіць*

**VI міжнародную навуковую канферэнцыю**
**«Сімяон Полацкі: светапогляд, грамадска-палітычная**
**і літаратурная дзейнасць»**,

*прысвечаную 395-годдзю з дня нараджэння Сімяона Полацкага*
*і 30-годдзю Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага*

Канферэнцыя традыцыйна праводзіцца кожныя 5 год і прысвечана даследаванням жыцця і творчасці Сімяона Полацкага ў кантэксце эпохі, аналізу ўплыву яго дзейнасці на сучасную культуру; праблемам этнаканфесійнага і сацыякультурнага развіцця Беларускага Падзвіння ў XVI–XVIII стст.; пытанням захавання, прэзентацыі і інтэрпрэтацыі помнікаў кніжнай культуры Беларусі ў музеях, бібліятэках і прыватных зборах.

Запрашаем да ўдзелу ўсіх, чые навуковыя інтарэсы адпавядаюць тэматыцы канферэнцыі па наступных напрамках: гісторыя, археалогія, культуралогія, філасофія, этналогія, філалогія, мастацтвазнаўства, педагогіка, кнігазнаўства.

Рэгістрацыя ўдзельнікаў канферэнцыі ажыццяўляецца на падставе заяўкі, пададзенай ва ўстаноўлены Аргкамітэтам тэрмін. Заяўкі на ўдзел у канферэнцыі і тэзісы выступленняў прымаюцца **да 20 кастрычніка 2024 г.** на электронную пошту simeon.polotsk@museum.by.

## ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ У КАНФЕРЭНЦЫІ

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку.
2. Вучоная ступень, званне.
3. Пасада і месца працы.
4. Назва даклада і асноўныя тэзісы (аб’ём да 1 старонкі А4).
5. Кантактны тэлефон.
6. Адрас электроннай пошты.
7. Неабходнасць браніравання месца ў гасцініцы (дата, колькасць дзён).

Запрашэнні будуць высланы пасля заканчэння рэгістрацыі.

Праграма канферэнцыі будзе сфарміравана к сярэдзіне лістапада 2024 г. і выслана на электронную пошту зарэгістраваных удзельнікаў.

***Рэгламент выступлення на канферэнцыі – да 15 хвілін.***

Рабочыя мовы: беларуская, руская.

Мяркуецца публікацыя матэрыялаў канферэнцыі. Аргкамітэт пакідае за сабой права рэгістрацыі ўдзельнікаў канферэнцыі і адбору матэрыялаў для публікацыі.

## ПАТРАБАВАННІ ДА АФАРМЛЕННЯ МАТЭРЫЯЛАЎ

- матэрыялы для публікацыі прымаюцца ў ***2 тэкставых файлах***: у фармаце **docx** (магчымы doc, odt) і **pdf**;
- аб'ём да 10 старонак А4 (шрыфт Times New Roman, кегль 14 з адзінарным міжрадковым інтэрвалам; выраўноўванне па шырыні без пераносаў; палі: верхняе і ніжняе – 2 см, левае – 3 см, правае – 1,5 см; абзацны водступ – 1,25 см);
- для грэчаскай мовы рэкамендуецца выкарыстоўваць шрыфт «Hellenica», для царкоўнаславянскай – «CyrillicaOchrid1», дапускаецца шрыфт «Ижица»;
- колькасць выяў – да 10 шт.; фармат: tiff, jpeg; вырашальнасць: 300 dpi; высылаюцца асобнымі файламі.

***Тэрмін падачы матэрыялаў для публікацыі – да 20 снежня 2024 г.***

Камандзіровачныя выдаткі за кошт накіроўваючай арганізацыі.

**Кантактныя дадзеныя Аргкамітэта:**
- тэлефоны для даведак:
*Гаўрылава Славіна Вячаславаўна, кандыдат культуралогіі, загадчык філіяла* +375 29 694-81-51
*навуковыя супрацоўнікі* +375 214 46-57-25
- электронная пошта: simeon.polotsk@museum.by
- адрас: вул. Ніжне-Пакроўская, 22, г. Полацк, Віцебская вобл., Рэспубліка Беларусь, 211415.